# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі **Кароль Ніны Барысаўны**
*"Принципы полифонического повествования в прозе XXI века (на материале произведений Е. Водолазкина, М. Шишкина, В. Шарова)"*, прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – Тэорыя літаратуры. Тэксталогія

Дысертацыйная праца Н. Б. Кароль прысвечана важнай і, здавалася б, добра вывучанай тэарэтычнай праблеме сучаснага літаратуразнаўства. Аднак, як слушна заўважае сама спашукальніца, сучасныя даследаванні паліфаніі вызначаюцца вузкай скіраванасцю і ахопліваюць не ўвесь твор, а пэўны ўзровень тэксту (наратыўны, персанажны, жанравы, семантычны і г. д.) (с. 1, 3 Аўтарэферата). Паспяховае пераадоленне гэтага недахопу, вядома, немагчыма без вызначэння ролі той "інстанцыі", якая арганізуе мастацкае цэлае твора – аўтарскай свядомасці. У якасці базавага кампанента гэтай "інстанцыі" шаноўная даследчыца прапануе аўтарскі пункт погляду (*точку зрения / завершающую точку зрения*). Праца Н. Б. Кароль у гэтым сэнсе прэзентуе новую метадалогію даследавання паліфаніі ў мастацкім творы.

Дастаткова прадуманымі выглядаюць як даследчыцкая ўстаноўка Н. Б. Кароль у цэлым, так і канкрэтныя фармулёўкі мэты і задач: разглядаецца стан вывучэння заяўленай праблемы (таму сціслы выклад гісторыі даследавання паліфанічнага рамана з'яўляецца дарэчным і апраўданым); вызначаюцца тэарэтычныя лакуны (адсутнасць даследаванняў, якія разглядалі б паліфанічны твор у адзінстве яго мастацкіх, структурна-кампазіцыйных і ідэйна-ідэалагічных складнікаў); прапануюцца канкрэтныя шляхі іх запаўнення (уласная метадалогія даследавання, інтэгральным элементам якой выступае аўтарскі пункт погляду). Такі падыход надае дысертацыйнаму даследаванню лагічнасць, а зробленым даследчыцай высновам – абгрунтаванасць. Вынікам адказнага навуковага падыходу да заяўленай праблемы з'яўляецца арганічная спалучанасць у працы тэарэтычных распрацовак і практычнага аналізу твораў.

Ажыццёўленае Н. Б. Кароль даследаванне, такім чынам, а) пашырае тэарэтычны аб'ём паняцця паліфаніі ў літаратуразнаўстве; б) раскрывае такія прыёмы паліфанічнага пісьма, якія дазваляюць весці гаворку пра пэўныя заканамернасці ў яго рэалізацыі на розных структурных узроўнях твора. Таму ёсць усе падставы сцвярджаць, што прадстаўленае даследаванне вызначаецца метадалагічным наватарствам, структурнай прадуманасцю і тэарэтычнай імавернасцю / верыфікацыйнасцю атрыманых вынікаў.

Разам з тым, кожнае прачытанне навуковай працы выглядае марным, калі яно не спараджае пэўных удакладняльных пытанняў да аўтара.

1. М. Бахцін у сваіх даследаваннях акцэнтуе ўвагу, што пазіцыя “знешняга перабывання” (*вненаходимости*) з’яўляецца сапраўды аўтарскай, бо толькі адстараніўшы самога сябе аўтар здольны ствараць цэльныя вобразы герояў у іх складанай жыццёва-падзейнай узаемасувязі без прыўнясення аўтарскай суб’ектыўнасці. Як суадносіцца гэтая навуковая пазіцыя з метадалагічнай прапановай шаноўнай даследчыцы, заяўленай у мэце работы: *“выявить и охарактеризовать основные принципы полифонического повествования в современной прозе в их взаимодействии с авторской точкой зрения”* (с. 2 Аўтарэферата)? Ці няма тут пэўнай супярэчнасці, паколькі аўтарскі пункт погляду апрыёры з’яўляецца суб’ектыўным?

2. Ці існуе ў межах прадстаўленага даследавання істотная розніца, з аднаго боку, паміж паняццямі *“авторская точка зрения”* і *“авторская позиция”* і, з другога, *“авторская позиция”*, *“завершающее авторское слово”* і *“идейная интенция”*?

Зазначым, што дадзеныя пытанні маюць удакладняльны характар і не ўплываюць на нашу высокую ацэнку прадстаўленай працы. Як вынікае з прэзентаванай у аўтарэфераце канцэпцыі, кваліфікацыйнае даследаванне Н. Б. Кароль выканана на высокім навуковым узроўні і адпавядае патрабаванням, што прад’яўляюцца да прац такога ўзроўню. Лічу, што дысертацыя *“Принципы полифонического повествования в прозе XXI века (на материале произведений Е. Водолазкина, М. Шишкина, В. Шарова)”* цалкам адпавядае спецыяльнасці 10.01.08 (Тэорыя літаратуры. Тэксталогія) і профілю савета Д 01.42.04, у які прадстаўлена да абароны, а Ніна Барысаўна Кароль заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

12.12. 2025 г.

Доктар філалагічных навук, дацэнт,
вядучы навуковы супрацоўнік
аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры
ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай
культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” А. У. Бразгуноў

Подпіс Бразгунова А.У.
СВЕДЧУ
Вядучы спецыяліст па кадрах
Н.В. ...кава
12 12 2025